## ПАВЫШАЮЦЦА ПЕНСІІ

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь 13 жніўня падпісаў Указ № 352 «Аб павышэнні пенсій». Дакументам прадугледжваецца правесці з 1 верасня 2015 года карэкціроўку фактычнага заробку пенсіянераў і пераразлік працоўных пенсій.**

**У выніку з 1 верасня працоўныя пенсіі грамадзян павялічацца ў сярэднім на 5%.**


Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

14 ЖНІЎНЯ 2015 г. ПЯТНІЦА № 154 (28012) Кошт 2000 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА




**Пакупнікам на заметку**

СТАР. 2



**Праграма тэлебачання на наступны тыдзень**

**20 КАНАЛАЎ**

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Лілія АНАНІЧ, міністр інфармацыі:**

*«Дырэктыва №1 — гэта адказнасць і для сродкаў масавай інфармацыі, бо ў дакуменце дакладна прапісаны задачы прэсы. Сёння любыя рашэнні і дзеянні, якія вызначаюць стратэгію развіцця народнай гаспадаркі ў галіне бяспекі жыццядзейнасці, павінны ажыццяўляцца з улікам дасягненняў у гэтым пытанні МНС, МУС і іншых зацікаўленых структур. СМІ павінны фарміраваць правільную думку, каб людзі разумелі неабходнасць сумеснага ўмацавання парадку ў нашым беларускім доме».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 14.08.2015 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 15997,00 | ▲ |
| Еўра | 17781,00 | ▲ |
| Рас. руб. | 249,71 | ▼ |
| Укр. грыўня | 744,05 | ▼ |

ISSN 1990 - 763X

# ПАЛЯВОЕ БРАТЭРСТВА



Фота Аляксандра ШАБЛЮКА.

**Вайскоўцы з 86-й брыгады сувязі, якія дапамагаюць аграрыям з адкрытага акцыянернага таварыства «Суцінскі» Пухавіцкага раёна збіраць ураджай, абедаюць разам з мясцовымі хлеваробамі ў полі (на фота злева направа: Кірыл ЖОГАЛЕЎ, Аляксандр КУРГАНОВІЧ і Эдуард ЛАВІЦКІ).**

■ Чым не курорт?

## БЛІЖЭЙ ДА ВАДЫ!

### Мінчане шукаюць паратунак ад спёкі на пляжах

**Тэмпературныя рэкорды не перастаюць здзіўляць беларусаў. Калі слупок тэрмометра падымаецца вышэй за 35 градусаў, адзінае, чаго хочацца, — гэта вады і свежага паветра. Карэспандэнт «Звязды» атрымала заданне даведацца, дзе і як мінчане і госці сталіцы праводзяць па-сапраўднаму паўднёвыя дзянькі.**



**На Цнянскім вадасховішчы для веласіпедаў прадугледжана шмат стаянак, якія, на жаль, пустуюць.**

### ПРА МЕСЦЫ, ТРАНСПАРТ, ЧЭРГІ І ВАДУ

Па інфармацыі санітарна-эпідэміялагічнай службы Мінска, у горадзе і ваколіцах цяпер можна купацца ў сямі вадаёмах. Тры з іх знаходзяцца ў межах мегаполіса: Камсамольскае возера, вадасховішчы Цнянскае і Дразды. Астатнія — у найбліжэйшым прыгарадзе: вадасховішча Заслаўскае, больш вядомае як Мінскае мора, Крыніца, возера Вяча і рака Пціч. Я выбрала тыя месцы для адпачынку, якія знаходзяцца найбліжэй ад майго дома. Адзначу, што платныя пляжы нават не разглядаліся. Паспрабуем адпачыць эканомна, тым больш што сонца свеціць усюды аднолькава.

У нядзелю на Камсамольскім возеры няма хіба толькі лянівых ці тых, хто катэгарычна не прызнае сонечныя прамяні. Нягледзячы на аншлаг, месца для сябе і торбы з літрамі вады знайсці можна. Ёсць дзе размясціцца і на Цнянцы.

СТАР. 4

■ Надвор'е

## КАМФОРТНА

### У гэтыя выхадныя спадзе гарачыня і ўстановіцца лагоднае надвор'е

**Як расказаў карэспандэнту БЕЛТА галоўны сіноптык Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды Аляксандр БЯГАНСКІ, у першай палове тыдня ў краіне назіралася вельмі гарачае, у асноўным сухое надвор'е.**



Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

Сярэднясутачныя тэмпературы знаходзіліся ў межах 23-27 градусаў цяпла, што вышэй за кліматычную норму на 6-11 градусаў. Пры гэтым максімальныя тэмпературы ў большасці раёнаў краіны дасягалі плюс 30-34, а ў асобныя дні — плюс 35-36 градусаў, ноччу паветра не астуджалася да 15-21 градуса са знакам плюс.

У выхадныя, 15-16 жніўня, тэрыторыя краіны будзе знаходзіцца пад уплывам вобласці павышанага атмасфернага ціску. Ападкаў не чакаецца. Тэмпература паветра ўначы складзе 7-14 градусаў вышэй за нуль, днём прагназуецца 21-28 градусаў цяпла, толькі ў паўднёва-заходніх раёнах будзе на пару градусаў цяплей: ноччу — плюс 15-17, днём — 29-31 градус вышэй за нуль.

У пачатку наступнага тыдня надвор'е ў краіне абумовіць вобласць павышанага атмасфернага ціску, з поўначы Еўропы будуць паступаць прахалодныя паветраныя масы. У панядзелак, 17 жніўня, будзе пераважна без ападкаў. Тэмпература паветра ўначы складзе 7-14 градусаў вышэй за нуль, па паўднёвым захадзе слупок тэрмометра падымецца да плюс 17 градусаў, днём чакаецца 18-25 градусаў цяпла, па поўдні паветра прагрэецца да плюс 27 градусаў.

У аўторак-сераду з распаўсюджваннем больш вільготных і няўстойлівых паветраных мас у асобных раёнах краіны пройдуць кароткачасовыя дажджы, днём магчымы навальніцы. Тэмпература паветра ўначы складзе 7-14 градусаў цяпла, днём будзе 18-24 градусы вышэй за нуль.

# ПРЫЯРЫТЭТЫ НАВУКІ

## Імі на наступную пяцігодку стануць энергетыка, бія-, нана- і медтэхналогіі

**Аб гэтым далажыў Аляксандру Лукашэнку старшыня Прэзідыума Нацыянальнай акадэміі навук Уладзімір Гусакоў, перадае карэспандэнт БЕЛТА.**

У час даклада ішла размова аб 13 прыярытэтах навуковай дзейнасці на будучую пяцігодку. Пад гэтыя прыярытэты распрацаваны пералік праграм асноўных навуковых даследаванняў. Цяпер ідзе іх напаўненне канкрэтнымі заданнямі і праектамі. Аляксандру Лукашэнку было даложана таксама аб крыніцах фінансавання прапануемых навуковых даследаванняў і будучых рынках збыту прадукцыі. Кіраўнік дзяржавы выказаў жаданне ў найбліжэйшы час сустрэцца з беларускімі вучонымі, якія прадстаўляюць не толькі НАН, але і вузаўскую, галіновую навуку, з тым, каб падвесці вынікі зробленага і абмеркаваць планы.

Акрамя таго, Уладзімір Гусакоў праінфармаваў Прэзідэнта аб выкананні праграмы ўдасканалення навуковай сферы. Кіраўнік дзяржавы нагадаў, што ў свой час паступала шмат прапаноў па рэфармаванні Нацыянальнай акадэміі навук, якія прадугледжвалі ў тым ліку скарачэнне колькасці функцый НАН, пазбаўленне яе ўласнасці і гэтак далей. «Я ніколі не прытрымліваўся такой практыкі і зыходзіў з таго, што хопіць ужо гэтых рэформ, давайце спакойна жыць і ўдасканальваць працэсы, каб не спыніцца, не застыць», — адзначыў Прэзідэнт. Такое рашэнне было прынята і адносна Акадэміі навук.

Што датычыцца зрухаў у рэалізацыі праграмы ўдасканалення навуковай сферы, кіраўнік дзяржавы цікавіўся ў тым ліку і эканамічным эфектам. «Калі навука не ўплывае на фінансавае становішча дзяржавы і сама целяпаецца з боку ў бок, не зарабляючы грошы хаця б на ўласнае ўтрыманне, гэта ўжо не арганізацыя (НАН. — **БЕЛТА**)», — лічыць Аляксандр Лукашэнка.

Быў прыняты шэраг мер для таго, каб забяспечыць Акадэміі навук магчымасцю быць самадастатковай у фінансавых адносінах. Адначасова праводзіцца структурная і кадравая аптымізацыя. Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што ў акадэміі павінны быць рэальна працуючыя структуры. У святле гэтай праблемы аптымізацыя Акадэміі навук праводзілася такім чынам, каб пакінуць там толькі тое, што патрэбна для дзяржавы. Як было даложана кіраўніку дзяржавы, за апошні год сем арганізацый НАН было рэарганізавана і далучана. Цяпер іх 113, у тым ліку 63 навуковыя і 29 вытворчых прадпрыемстваў.

# НА МІЖНАРОДНЫМ УЗРОЎНІ

## Пройдзе чарговы перапіс насельніцтва

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка даручыў да канца жніўня прадставіць задуму правядзення перапісу насельніцтва краіны, які пройдзе ў 2019 годзе. Такую задачу кіраўнік дзяржавы паставіў, прымаючы з дакладам старшыню Нацыянальнага статыстычнага камітэта Іну Мядзведзеву, перадае карэспандэнт БЕЛТА.**

Прэзідэнт паставіў строгія задачы па эканоміі сродкаў пры правядзенні гэтага перапісу. Ён таксама даручыў прапрацаваць пытанні правядзення перапісу ўласнымі сіламі работнікаў органаў дзяржаўнага кіравання і мясцовых Саветаў. Такім чынам, перапіс павінен быць праведзены на міжнародным узроўні, але пры максімальным зніжэнні затрат на яго.

Кіраўнік дзяржавы лічыць, што ў краіне дастаткова сіл і сродкаў, каб зрабіць усё якасна і своечасова, аднак галоўнае — падысці да пытання па-зямному і па-гаспадарску.

Перапіс насельніцтва пройдзе па той схеме і з дапамогай тых метадаў, якія прапануюць урад і Белстат, зыходзячы з рэалій сённяшняга дня. Аляксандр Лукашэнка даручыў у самыя кароткія тэрміны прадставіць новую задуму правядзення перапісу.

Як далажыла Іна Мядзведзева, Эканамічным і сацыяльным саветам ААН прынята рэзалюцыя аб праграме правядзення перапісу насельніцтва і жыллёвага фонду да 2020 года. У Беларусі перапіс праводзіцца раз у 10 гадоў і ў год, які заканчваецца на 9. Такім чынам, наступны перапіс насельніцтва будзе праводзіцца ў 2019 годзе.

# ЗВАНІЦЕ — ВАС ПАЧУЮЦЬ

## На традыцыі ў суботу пройдуць прамыя тэлефонныя лініі

**На званкі жыхароў краіны адкажуць кіраўнікі гарадоў, раёнаў і абласцей, разам яны пастараюцца знайсці шляхі выхаду з праблемных сітуацый. Падобная сувязь функцыянуе ўжо больш за паўгода, за гэты час чыноўнікам патэлефанавалі тысячы людзей. Сотні пытанняў былі не толькі пачуты, але і вырашаны.**

Людзей традыцыйна турбуюць праблемы, звязаныя з жыллёва-камунальнай гаспадаркай, сацыяльнымі выплатамі, капітальным рамонтам, добраўпарадкаваннем тэрыторый.

Мінгарвыканкам і аблвыканкамы праводзяць прамыя тэлефонныя лініі і ў гэтую суботу, 15 жніўня, свае пытанні можна задаць з 9.00 да 12.00.

**Брэсцкі аблвыканкам:** намеснік старшыні Сяркоў Міхаіл Мікалаевіч (80162213121);

**Віцебскі аблвыканкам:** кіраўнік спраў Мацюшка Аляксей Уладзіміравіч (80212204260);

**Гомельскі аблвыканкам:** першы намеснік старшыні Максіменка Аляксандр Уладзіміравіч (80232751237);

**Гродзенскі аблвыканкам:** старшыня Краўцоў Уладзімір Васільевіч (80152735644);

**Мінскі аблвыканкам:** першы намеснік старшыні Макар Ігар Мікалаевіч (80175004160);

**Магілёўскі аблвыканкам:** намеснік старшыні Некрашэвіч Віктар Уладзіміравіч (80222501869);

**Мінскі гарвыканкам:** намеснік старшыні Карпенка Ігар Васільевіч (80172224444).

■ Азбука спажыўца

# РАБІЦЕ ПАКУПКІ З ХАЛОДНАЙ ГАЛАВОЙ

**За 7 месяцаў бягучага года юрысты Беларускага таварыства абароны спажыўцоў заявілі 335 прэтэнзій і іскаў. Да таго ж за гэты час у рэспубліканскую грамадскую арганізацыю ад спажыўцоў паступіла каля 4 тысяч званкоў.**

— Спецыфіка нашай працы заключаецца ў тым, што, як правіла, да нас звяртаюцца людзі, незадаволеныя або якасцю аказаннай паслугі, або ў іх узніклі прэтэнзіі да якасці набытага тавару, — расказвае **старшыня таварыства Ганна СУША**. — А вось па кансультацыю, перш чым набыць той ці іншы тавар або заключыць дагавор на паслугу, да нас звяртаюцца, на жаль, рэдка.

Прыкладна 60% усіх скаргаў прыпадае на сферу паслуг: турыстычныя, жыллёва-камунальныя, цырульніцкія і гэтак далей. Беларусы сталі жыць больш заможна, таму актыўна будуюцца і рамантуюць сваё жыллё: шмат скаргаў паступае на замену вокнаў і дзвярэй.

Жнівень, па словах Ганны Сушы, увогуле атрымаўся вельмі «гарачы»: шмат скаргаў ад турыстаў, якія хацелі б адмовіцца ад вандроўкі ў Турцыю ў сувязі з неспакойным становішчам у гэтай краіне і не згубіць пры гэтым свае грошы. І вось тут трэба ўважліва чытаць, што запісана ў дагаворы: якія выдаткі, што панесла турфірма, ужо нельга вярнуць.

Што тычыцца якасці тавараў, то, як правіла, 9 з 10 скаргаў звязаны з набыццём тавараў у інтэрнэт-крамах. Купляць тавары ў стацыянарных магазінах і гандлёвых цэнтрах пакупнікі ўжо навучыліся. Затое цяпер усе праблемы перамясціліся ў інтэрнэт. Беларусы набываюць у сеціве не толькі складанатэхнічныя тавары, але і абутак, адзенне, друкаваную прадукцыю, прадукты харчавання і гэтак далей. Па звестках Міністэрства гандлю, у гандлёвым рэестры зарэгістравана ўжо 16,5 тысячы інтэрнэт-крам. Толькі за паўгода іх колькасць павялічылася на 5 тысяч, або на 42%. З улікам папулярнасці гэтай формы здзяйснення пакупак спажыўцам усё ж такі давядзецца адукоўвацца ў гэтай сферы.

— Першае правіла — шукайце інтэрнэт-магазін з «гісторыяй», з добрай рэпутацыяй. І навучыцеся кур'еру адмаўляць, калі той не хоча прадэманстраваць пакупніку тэхнічны тавар у дзеянні, не можа прадаставіць увесь пакет дакументаў на тэхніку, гарантыйны талон, касавы чэк і інструкцыю, — раіць Ганна Суша.

**Інтэрнэт-крамы абавязаны будуць указваць на сваім сайце яшчэ і інфармацыю пра тое, якімі спосабамі пакупнік можа разлічыцца за тавар дыстанцыйна.**

— Даволі часта, калі спажывец цікавіцца ў прадаўца наяўнасцю тэхнічнага пашпарта і інструкцыі па эксплуатацыі на рускай мове, то чуе, што ўсю гэтую інфармацыю можна знайсці ў інтэрнэце ў свабодным доступе. Калі вам так адказваюць, вельмі высокая верагоднасць набыць «шэры тавар», асабліва ў вобласці тэлефаніі, — папярэджвае **намеснік начальніка ўпраўлення абароны спажыўцоў і кантролю за рэкламай Міністэрства гандлю Вольга КРАЎЦОВА**. — Здараецца, што пакупніку выдаецца талон на гарантыйнае абслугоўванне з пячаткай сэрвіснага цэнтра, але ніякіх звестак пра прадаўца ён не ўтрымлівае. І толькі калі ўзнікаюць праблемы з якасцю тавару, распачынаюцца пошукі, якія не прыносяць плёну. Спажыўцы нават не захоўваюць скрыншот старонкі інтэрнэт-крамы. Нелегалізаваны інтэрнэт-магазін сёння ёсць, а заўтра яго няма. Абавязкова правярайце яго наяўнасць у гандлёвым рэестры на сайце Міністэрства гандлю, асабліва калі збіраецеся здзейсніць дарагую пакупку.

Дарэчы, са снежня інтэрнэт-крамы абавязаны будуць указваць на сваім сайце яшчэ і інфармацыю пра тое, якімі спосабамі пакупнік можа разлічыцца за тавар дыстанцыйна.

Яшчэ адна адметнасць апошняга часу — арганізацыя выязных прэзентацый, на якія людзей заманьваюць і прапануюць ім набываць за шалёныя грошы коўдры з супершэрсці, падушкі, без якіх проста немагчымы здаровы сон, наборы цудадзейных каструль або суперкасметыку... Такія прэзентацыі любяць наведваць нямалыя людзі, у якіх ёсць шмат вольнага часу.

— Як правіла, пакупкі на прэзентацыях робяцца спантанна. Спажыўцам прапануюць падпісаць дакумент аб продажы тавару ў растэрмінову. Дагаворы мала хто чытае да канца, таму спажыўцы і не бачаць расстаўленых там пастак. А потым, каб адбывацца «працэражэнне», яны тэлефануюць да нас і пытаюцца, як ім вярнуць тавар, — расказвае Ганна Суша. — Тым больш у дагаворах часта пазначана, што тавар вяртаецца па месцы знаходжання прадаўца і ў непасрэднай прысутнасці пакупніка. А калі размова ідзе пра нямалагода чалавека, які да таго ж жыве ў іншым горадзе?..

— «Перыяд ахалоджвання» для «гарачых» пакупнікоў, якія здзяйсняюць спантанныя пакупкі, складае 14 дзён, на працягу якіх яны могуць перадумаць і вярнуць прадаўцу тавар, калі той не быў у карыстанні. Калі пакупнік, які заключаў дагавор, не можа прысутнічаць асабіста, у яго ёсць права аформіць даверанасць.

І яшчэ некалькі парад спажыўцам: не спрабуйце высветліць адносіны з прадаўцом па тэлефоне. Ён проста ўключыць ваш тэлефонны нумар у чорны спіс і вы ўжо ніколі да яго не зможаце дазваніцца. Усе прэтэнзіі трэба афармляць пісьмова. Калі прадавец насустрач спажыўцу не ідзе, трэба звяртацца ў выканкам па месцы рэгістрацыі прадаўца або па месцы жыхарства спажыўца. Адтуль усё роўна гэты зварот перадрасуюць па месцы рэгістрацыі індывідуальнага прадпрымальніка або юрыдычнай асобы. Ёсць яшчэ і сетка грамадскіх арганізацый па абароне правоў спажыўцоў. Там таксама могуць дапамагчы...

**Надзея НІКАЛАЕВА.**
*nikalaeva@zviazda.by*

■ Свет вакол нас



# АНГОЛЬСКІЯ ПЕРСПЕКТЫВЫ

**У апошнія гады беларуская дыпламатыя здзяйсняе прарыў за прарывам у развіцці адносін як з асобнымі краінамі, так і з прэстыжнымі міжнароднымі арганізацыямі. Гэта, у сваю чаргу, выклікае ўсё большую цікавасць да нашай краіны з боку замежных дзяржаў, многія з якіх раней не фігуравалі ў спісе прыярытэтаў знешняй палітыкі. Да адной з іх, безумоўна, можна аднесці Анголу. Здавалася б, у ёй толькі дзесяцігоддзе таму скончылася доўгая і кровапралітная грамадзянская вайна, дык што ж Ангола можа прапанаваць Беларусі з таго, што зможа нас зацікавіць?**

У ліпені 2014 года Сусветны банк унёс Анголу ў дзясятку афрыканскіх краін, у якія варта інвеставаць. Прычынамі сталі стабільнае кіраванне краінай, шырокі рынак, наяўнасць карысных выкапняў. Адной з прычын стала таксама ўсё больш нарастальная роля эканомік, якія развіваюцца, у сусветнай эканамічнай актыўнасці, што прымушае інвестараў пераглядаць ранейшыя прыярытэты. Гадам раней Анголе прадказалі ганаровую ролю адной з дваццаці самых хуткарастучых эканомік свету ў найбліжэйшай перспектыве. Тэмпы росту эканомікі ў 7-8 працэнтаў у год на працягу апошніх гадоў, безумоўна, выклікаюць павагу. Нагадаю, што яны былі характэрныя і для Беларусі да пачатку сусветнага фінансавага крызісу і эканамічных наступстваў украінскай трагедыі. І вярнуцца да іх нам трэба не пры дапамозе развіцця адносін з еўрапейскімі краінамі, якія знаходзяцца ў эканамічнай дэпрэсіі, а праз актыўны пошук партнёраў па-за межамі еўрапейскага рэгіёна, якія эфектыўна развіваюцца.

Па памеры тэрыторыі Ангола знаходзіцца на 22-м месцы ў свеце і на 7-м месцы ў Афрыцы. Яна прыкладна супастаўная з тэрыторыяй чатырох з паловай Вялікабрытаній.

Ангола таксама вызначаецца хуткім ростам насельніцтва. Яно ўжо ў 2,5 раза большае, чым у Беларусі, што ў спалучэнні з хуткімі тэмпамі эканамічнага росту робіць рынак Анголы ўсё больш прывабным для экспарцёраў прамысловых тавараў, у тым ліку і з нашай краіны.

Характэрнай асаблівасцю ангольскай эканомікі з'яўляецца вялікая залежнасць ад здабычы і экспарту нафты. Гэты сектар складае каля 80 працэнтаў ангольскай эканомікі, што вельмі небяспечна для ўстойлівага развіцця краіны. У сувязі з рэзкім падзеннем цэн на нафту на сусветных рынках ужо пачалося запавольванне тэмпаў росту ангольскай эканомікі. Каб пазбегнуць такой згубнай залежнасці ў будучыні, ангольскі ўрад зацікаўлены ў дыверсіфікацыі эканомікі. У сувязі з недахопам спецыялістаў у іншых сферах эканомікі адзін з натуральных прыярытэтаў — развіццё сельскай гаспадаркі, якая з'яўляецца крыніцай існавання большай часткі эканамічна актыўнага насельніцтва. У гэты ж час сённяшняя сельская гаспадарка краіны шмат у чым прымітыўная і аграрыі не валодаюць сучаснымі тэхналогіямі апрацоўкі зямлі, у недастатковай ступені выкарыстоўваюцца сродкі механізацыі. Другі прыярытэт — распрацоўка радовішчаў карысных выкапняў, не звязаных з нафтавым сектарам. Ангола вядомая на сусветных рынках сваімі алмазнымі шахтамі, але ў краіне ёсць і шмат іншых прыродных выкапняў, найбольш перспектыўнымі з якіх з'яўляюцца золата і медзь.

Беларусь мае багаты досвед трансфармацыі эканомікі ў няпростых умовах, што можа быць карысна і Анголе. Асаблівую значнасць для нашай краіны набывае ангольскі рынак у сувязі з магчымасцю перанакіраваць туды частку выраблянай у нашай краіне сельскагаспадарчай тэхнікі, якая больш не запатрабавана на традыцыйных рынках Расіі і Украіны з прычыны ахапіўшага іх крызісу. Безумоўна, зможа адыграць Беларусь і важную ролю ў павышэнні якасці падрыхтоўкі спецыялістаў для ангольскай эканомікі. Ангольскія студэнты навучаліся ў ВНУ Беларусі ў савецкія гады, і нашы ўніверсітэты могуць прапанаваць карысныя праграмы для іх і ў XXI стагоддзі. Цеснае супрацоўніцтва з Беларуссю ў сферы сельскай гаспадаркі зможа дапамагчы Анголе асвоіць і важны кірунак сельскагаспадарчага экспарту. Маюць беларускія прадпрыемствы і вялікі вопыт у галіне разведкі і здабычы карысных выкапняў, што можа аказацца запатрабаваным з ангольскага боку.

Яшчэ адзін аб'яднальны фактар для супрацоўніцтва — цесная кааперацыя і Беларусі, і Анголы з Кітаем. Ён з'яўляецца пакупніком ангольскай нафты і найбуйнейшым пастаўшчыком прамысловай прадукцыі на ангольскі рынак, у апошнія гады вылучыў мільярды долараў на інвестыцыі ў эканоміку Анголы. Беларуска-кітайскаму супрацоўніцтву быў нададзены новы імпульс пасля візіту Старшыні КНР у маі гэтага года ў Мінск.

Падчас працоўнага візіту Валянціна Рыбакова, намесніка міністра замежных спраў нашай краіны, у Анголу 10-11 жніўня было пачата абмеркаванне магчымасцей кааперацыі ў вышэйназваных сферах для ўмацавання беларуска-ангольскага супрацоўніцтва.

**Сяргей КІЗІМА,**
**доктар палітычных навук**

■ Каб памяталі

# ІМЁНЫ БУДУЦЬ ЖЫЦЬ ВЕЧНА

**У расійскім Белгарадзе ўбачыла свет унікальная кніга «Засталіся маладымі». Аўтарскі калектыў не толькі ўзнавіў ход знакамітай Прахараўскай бітвы, якая адбылася ў ліпені 1943 года, але і склаў даволі вялікія спісы загінулых салдат і афіцэраў Чырвонай Арміі.**

Прахараўку называюць трэцім ратным полем — пасля Кулікова і Барадзіна. Падчас Курскай бітвы ў смяротным паядынку тут сышліся буйныя танкавыя злучэнні ваюючых бакоў. У задымленым небе лютавала штурмавая нямецкая авіяцыя. Ад бесперапыннага лійню густа падаючых бомбаў, снарадаў і мін зямля цяжка скаланалася, хадзіла хадуном, уставала на дыбы ад выбухаў.

Вось што ўспамінаў камандзір танкавага ўзвода Аляксей Ілларыёнаў: «Дзень пераўтвараўся ў ноч, зямля злучылася з небам. Танк ішоў на танк. 60 машын падпалкоўніка Тарасава рынуліся на поле Прахараўскае і ўсе да адзінага згарэлі ў сустрэчным баі. Гэта было пекла!»

Падобныя адчуванні і ў нямецкага танкіста Вільгельма Роса: «Усюды палаючыя танкі, з якіх выскокваюць людзі ў палаючых чорных камбінезонах... Грукат, выбухі, парахавы смурод... Злавесная карціна».

Перамога ў бітве на Курскай дузе дазволіла Чырвонай Арміі вырваць, нарэшце, у немцаў стратэгічную ініцыятыву і дабіцца карэннага пералому ў ваенным супрацьстаянні. Гітлераўскі вермахт нават не падумваў больш ні пра якія аперацыі і, як цяжкапаранены звер, вымушаны быў, драпежна агрызаючыся, марудна адпаўзаць на захад, у свае логава.

Гісторыкі лічаць Прахараўскае поле самай вялікай брацкай магілай Другой сусветнай вайны. Вядома, нямала там і беларусаў. Імёны нашых землякоў увекавечаны ў журботных спісах загінулых воінаў у кнізе «Засталіся маладымі».

**Анатоль БРУЦКІ.**
*г. Віцебск*

■ Добрая навіна

# «ЗОРКІ» НАЦЫЯНАЛЬНАГА АЭРАПОРТА

**Нацыянальны аэрапорт «Мінск» па выніках комплекснага даследавання якасці інфраструктуры і ўзроўню камфорту пасажыраў, праведзенага расійскім агенцтвам «АвіяПорт», атрымаў высокую ацэнку: яму прысвоены індэкс «чатыры зоркі» з магчымых пяці.**

Папярэдняе аналагічнае даследаванне праводзілася ў 2013 годзе. З таго часу колькасць уцягнутых у яго аэрапортаў павялічылася больш чым у паўтара раза, а само яно перастала быць выключна расійскім. Менавіта нацыянальны аэрапорт «Мінск» — першыя замежныя «паветраныя вароты», якія трапілі пад увагу расійскай кампаніі.

Методыка ацэнкі агенцтва заснавана на 290 паказчыках, аб'яднаных у дзевяць функцыянальных блокаў, якія характарызуюць шлях пасажыра ад уваходу ў аэрапорт да пасадкі ў самалёт або, наадварот, ад спуску па трапе да выхаду з аэрапорта. Яна дазваляе дэталёва даследаваць якасць інфраструктуры і ўзровень камфорту пасажыраў і дакладна вызначыць моцныя і слабыя бакі кожнага аэрапорта. Кіраўніцтву апошняга такі падыход дазваляе абгрунтавана вылучаць прыярытэтныя кірункі для паляпшэння сітуацыі ў кароткай і сярэднекароткай перспектывах. Менавіта для гэтага і праводзяцца даследаванні, а прысуджаныя «зоркі» з'яўляюцца па сутнасці медыйным вынікам.

Найвышэйшы індэкс «пяць зорак» сёлета атрымалі два расійскія аэрапорты — Екацярынбург і Сочы. Эксперты адзначаюць, што ўвогуле ўзровень камфорту пасажыраў у параўнанні з мінулым даследаваннем істотна павысіўся. Разам з тым, каб здзейсніць якасны скачок у гэтай сферы, патрэбны інвестыцыі ў інфраструктуру, таму невялікія рэгіянальныя аэрапорты яшчэ доўга будуць заставацца нязручнымі для пасажыраў.

**Сяргей РАСОЛЬКА**




# ДОБРААХВОТНІКІ ВЫРАТАВАЛІ ЎРАДЖАЙ

**Аб загаранні трыцікале каля вёскі Бабоўцы лідскім ратавальнікам паведаміў член добраахвотнай пажарнай каманды, які дзяжурыў на аўтацыстэрне на месцы жніва.**

Работнікі сельгаспрадпрыемства «Мажэйкава» на трактары з плугамі ўзаралі ўчастак, які загарэўся, і падалі ваду з аўтацыстэрны. Гэта дазволіла ў значнай ступені прадухіліць распаўсюджанне агню. А канчаткова перамагчы вогненную стыхію ўдалося пасля прыбыцця пажарных разлікаў. Пажар знішчыў пасевы трыцікале на плошчы 3 гектары, выратавана 136 га. Згодна з інфармацыяй прэс-службы Гродзенскага абласнога ўпраўлення МНС, асноўная версія ўзгарання — парушэнне правілаў эксплуатацыі электрасетак і электраабсталявання, абрыў проваду лініі электраперадач.

**Барыс ПРАКОПЧЫК.**

■ Чулі?

# ДАЦЬ АДХОДАМ НОВАЕ ЖЫЦЦЁ

**Утварэнне макулатуры, шклабою, зношаных шын, непатрэбных палімерных упаковак неадрыўна звязана з паўсядзённым побытам. Выкінуць гэтыя адходы ў смеццеправод і забыць — гэта самае простае. Куды важней даць адходам другое жыццё. І тым сэканоміць рэсурсы на вытворчасць многіх вырабаў з нуля.**

— Сёлета завяршаецца Дзяржаўная праграма па зборы і нарыхтоўцы другасных матэрыяльных рэсурсаў, — **заўважыў намеснік міністра ЖКХ Анатоль ШАГУН.** — За першае паўгоддзе 2015 года праз рукі прыёмшчыкаў прайшло больш за 168 тысяч тон макулатуры, амаль 80 тысяч тон шкла... Гадавое заданне выканана на 40-50%. Прыемна адзначыць, што гэты сектар становіцца прыбытковым для бізнесу: недзяржаўныя арганізацыі сабралі 43% другаснай сыравіны. Рэшту паміж сабой раздзялілі перапрацоўшчыкі, арганізацыі сістэмы Белкаапсаюза і канцэрн «Белрэсурсы».

Зараз у Беларусі перапрацоўваецца 14% ад агульнага аб'ёму камунальных адходаў. Гэты паказчык даволі высокі, улічваючы, што шэсць гадоў таму, калі пачала дзейнічаць адпаведная дзяржаўная праграма, ён быў удвая меншы. Задача на гэты год — сабраць каля 700 тысяч тон другасных матэрыяльных рэсурсаў. Між іншым, зараз шклабой і макулатура актыўна прадаюцца за мяжу. Сальда імпарту і экспарту гэтай сыравіны для перапрацоўкі сёлета становіцца і складае каля 3 мільёнаў долараў ЗША ў эквіваленце. А яшчэ чатыры гады таму сітуацыя была адваротнай.

Адной з перашкод асобнаму збору адходаў камунальнікі лічаць смеццеправоды. Дэматывуе людзей і сітуацыя, калі змесціва кантэйнераў, напрыклад са шклом ці паперай, куляецца разам у адзін смеццявоз. З аднаго боку, сэканомлены паліва і працоўныя выдаткі. З іншага боку, чалавек пасля такога відовішча задасца пытаннем: а навошта тады самому сартаваць смецце, калі гэта па сутнасці будзе «сізіфава праца»?

— Мы правялі сацыялагічнае даследаванне ў Мінскай вобласці, — працягвае Анатоль Шагун. — І высветлілі, што насельніцтва заклапочана тэмай перапрацоўкі адходаў. Большая частка гатова іх збіраць паасобку. Але на пытанне, ці робіцца гэта ў жыцці, станоўча адказала толькі трэць апытаных. Пры гэтым у дамах, абсталяваных смеццеправодамі, гэтая лічба меншая ўтрая. Таму да 2017 года гэтую праблему трэба вырашыць. Іншая справа, ці паўсюль будзе магчыма заварыць смеццеправоды і паставіць дастатковую колькасць кантэйнераў для асобнага збору адходаў, зыходзячы з планіроўкі дваровых тэрыторый...

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**
*schklennik@zviazda.by*

■ Не прапусціце!

# ТУРЫЗМ З МЯДОВЫМ ПРЫСМАКАМ

**Па традыцыі 14 жніўня ля Блакітнай крыніцы ў Слаўгарадскім раёне праходзіць свята «Макавей», падчас якога адбываецца богаслужэнне і асвячаецца вада. Побач на вялікім лузе гудзе вялікі кірмаш, гучаць народныя спевы, праводзяцца розныя конкурсы. За дзень тут абарочваецца ад 50 да 70 тысяч чалавек, аб чым паведамілі ў Слаўгарадскім райвыканкаме. І гэта пры тым, што мерапрыемства праходзіць у 12 кіламетрах ад райцэнтра, у запаведным маляўнічым месцы.**

Разыначкай сёлетняга свята стане прэзентацыя вялікага турыстычнага праекта «Ад вытокаў да — развіцця», які атрымаў фінансавую падтрымку Еўрапейскага саюза. У райцэнтры нядаўна створаны Call-цэнтр, які будзе непасрэдна займацца прасоўваннем турыстычных паслуг. Гэта, так бы мовіць, яго першае баявое хрышчэнне. Стваральнікі абяцаюць шмат цікавых сюрпрызаў і адкрыццяў. На працягу некалькіх гадзін (з 10.00 да 16.00) можна будзе пачуць, чым наогул цікавы Слаўгарадскі раён, якія тут існуюць маршруты, што тут ёсць паглядзець. З'явіцца магчымасць пазнаёміцца з уладальнікамі аграсядзіб і даведацца пра іх паслугі. Карысныя кансультацыі па пытаннях падтрымкі аграбізнесу і сельскага турызму дадуць спецыялісты Белагпрамбанка, а эксперты Цэнтра па энергазберажэнні, які існуе пры раённай школе №1, параяць, як эканоміць не на шкоду сабе. Шмат чаго цікавага раскажуць слаўгарадскія рамеснікі.

Улічваючы, што шлях са Слаўгарада да месца падзей ляжыць праз рэчку і праз вялікую транспартную нагрузку ў раёне пантоннага моста адбываюцца заторы, арганізатары раяць іншагароднім гасцям дабірацца да Блакітнай крыніцы цераз Краснаполле: там няма воднай перашкоды. І бярыце паболей грошай. Каб хапіла і на мёд ад мясцовых пчаляроў, і на сувеніры, і на прысмакі. Усяго гэтага будзе болей чым багата.

**Нэлі ЗІГУЛЯ**



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## РАЗМОВЫ — БЕЗ АБМЕЖАВАННЯЎ

**16 жніўня больш як 5,3 мільёна чалавек змогуць размаўляць унутры сеткі МТС абсалютна бясплатна і без абмежаванняў. Дзень бясплатных зносін — ініцыятыва мабільнага аператара.**

Акцыя распаўсюджваецца на кожнага абанента МТС незалежна ад таго, на які тарыфны план ён падключаны. Для таго, каб скарыстацца бонусам, неабходна проста адправіць запыт USSD *775 #, пасля чаго на нумар абанента паступіць SMS-пацверджанне таго, што ўдзел у акцыі актываваны, і размовы з абанентамі МТС будуць бясплатнымі на працягу ўсёй нядзелі з 00:00 да 23:59.

Актываваць бонус можна ўжо пачынаючы з 12 жніўня, аднак дзейнічаць акцыя пачне ў нядзелю. Акрамя гэтага, у суботу і нядзелю пры тэлефанаванні ў цэнтр калектыўнага карыстання МТС абаненты будуць чуць напамін пра дзень бясплатных размоў.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

## ШУКАЙЦЕ «ЗЕБРУ» КАЛЯ ШКОЛЫ

**Сталічная дзяржаўтаінспекцыя правяла абследаванне вулічна-дарожнай сеткі, якая прылягае да школ і дашкольных устаноў.**

— У выніку распрацаваны мерапрыемствы па ўдасканаленні арганізацыі дарожнага руху і папярэджанні дзіцячага траўматызму, — паведамілі ў ДАІ ГУУС Мінгарвыканкама. — У прыватнасці, падрыхтаваны прапановы па абсталяванні 18 новых нерэгулюемых пешаходных пераходаў. За летні час многія кіроўцы адвыклі ад прысутнасці паблізу школ дзяцей, хаця першае верасня зусім хутка. Таму мы заклікаем іх быць максімальна ўважлівымі і зніжаць хуткасць паблізу пешаходных пераходаў. Звяртаемся таксама да бацькоў: правядзіце сваё дзіця па бяспечным маршруце, не кідайце малечу дзетак адных. Калі бачыце недахопы ў арганізацыі дарожнага руху, лічыце, што маршрут дзіцяці да школы можна зрабіць яшчэ больш бяспечным, пазваніце ў дзяжурную часць ДАІ па нумары: 222 17 17. Па кожнай канструктыўнай прапанове будуць прымацца канкрэтныя рашэнні.

**ДАРЭЧЫ**

*З пачатку года ў сталіцы пабудавана 25 святлафорных аб'ектаў, у 35 месцах усталяваны штучныя няроўнасці на праезнай частцы з абмежаваннем хуткаснага рэжыму да 40 кіламетраў у гадзіну. Для павышэння ўзроўню інфармаванасці кіроўцаў, бяспекі руху школьнікаў паблізу ўстаноў адукацыі усталяваны інфармацыйныя шчыты «Увага, дзеці», «Школа».*

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

## ДЗЕНЬ КВЕТАК У КАРОБЧЫЦАХ

**16 жніўня агратурыстычны комплекс «Каробчыцы», які знаходзіцца непадалёк ад Гродна, запрашае мясцовых жыхароў і турыстаў на Дзень кветак.**

Арганізатары падрыхтавалі для дзяцей анімацыйную праграму «Кветкавая палянка» (пачатак у 15 гадзін). Дзяўчынкі і хлопчыкі паўдзельнічаюць у конкурсе малюнкаў крэйдамі. А ўсіх дам чакае прыемны сюрпрыз: выезд на коні сапраўднага прынца — з кветкамі і... вершамі. Арганізатары прапануюць усім гасцям падрыхтаваць дома свой букет і прыняць удзел у выстаўцы-конкурсе «Мая любімая клумба». Пераможцу чакае прыз.

**Барыс ПРАКОПЧЫК.**

# БЛІЖЭЙ ДА ВАДЫ!

**(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)**

— Аліна распавядала, што ўчора ў Дрымлэнд хадзіла, — пачула я ад суседак па пляжы. — Не прадыхнуць, не праціснуцца! Лежакоў дзве тысячы, а людзей ледзь не ўсе чатыры! — І гэта за дзвесце тысяч рублёў!..

Іншая сітуацыя на возеры з месцам для транспарту. Калі вы прыехалі на аўтамабілі, давядзецца пятнаццаць хвілін пятнаццаць, каб прыпаркавацца. Пра цянёк тут і казаць няма чаго. Такога задавальнення на паркоўцы няшмат. На Камсамольскае лепш прыязджаць на грамадскім транспарце або веласіпедзе. Для апошняга тут прадугледжана шмат стаянак, якія, дарэчы, пустуюць. Мінчане і госці сталіцы трымаюць усё сваё пры сабе і ставяць веласіпеды непадалёк ад таго месца, дзе размясціліся. Падобная сітуацыя і на Цнянскім вадасховішчы.

Вада ў возеры, зразумела, не крыштальная, але асвяжыцца можна. Тым больш, на тэрыторыі пляжа працуюць душавыя кабінкі, дзе вадзіца быццам з крыніцы. Такая ж чыстая і халодная. Нягледзячы на апошні факт, чарга з шасці-сямі чалавек у душ ёсць амаль заўсёды. Дарэчы, кабінак для пераапранання значна больш, таму там вас ніхто гнаць у шыю не будзе.

— Малады чалавек, — звяртаючыся да хлопца ў сіняй кепцы, кажа жанчына гадоў пяцідзесяці, — прапусціце мяне наперад. Не магу больш на гэтай спякоце стаяць. На Цнянцы душ заўсёды пустуе. Мабыць, не ўсе ведаюць, што знаходзіцца ён каля туалетаў. А тут проста не дачакацца чаргі!



На Камсамольскім возеры сапраўдны аншлаг!

## ПРА ЭЛЕКТРАМАБІЛІ, ВАЛЕЙБОЛ І ЦЭНЫ

Самымі актыўнымі, на мой погляд, наведвальнікамі возера з'яўляюцца дзеці. Здаецца, гадзінамі плёскаліся б у вадзе! Але бацькі не дрэмлюць. Каб малое без слёз і істэрык хоць трохі сагрэлася, мамы і таты бяруць кашалькі і ідуць да цэнтра пляжа.

— Мама, хачу пакатацца на машынцы! Вось на гэтай, чырвоненькай, — паказваючы пальцам на чатырохколавы транспарт, кажа хлопчык гадоў пяці. — І на батут пайшлі!

Каштуюць дзіцячыя забавы далёка не па-дзіцячы. Напрыклад, за пяць хвілін язды на тым жа электрамабілі прыйдзецца аддаць 30 тысяч рублёў, столькі ж абыдцаць і дзесяць хвілін на батуце і надзіманай горцы. Згуляць у настольны хакей каштуе 20 тысяч. Дарэчы, нягледзячы на такую разнастайнасць атракцыёнаў і гульняў, аншлаг збіраюць звычайныя бясплатныя «савецкія» арэлі. На Камсамольскім возеры іх трое. А шкада, бо такая забава, як кажуць самі бацькі, і дзецям падабаецца, і па кашальку не б'е.

Дарослым тут таксам ёсць чым заняцца. Веласіпед на гадзіну вам дадуць за 45 тысяч рублёў, бадмінтон і валейбольны мяч — за 30, фрысбі — за 15. Але, па маіх назіраннях, гэта задавальненне асабліва попытам не карыстаецца. Мяч і ракеткі людзі прыносяць з сабою. На пляжы ёсць дзве абсталяваныя пляцоўкі для гульні ў валейбол, але, праўда, сетку тут нацягнуць забыліся. Аматаркі спорту Аня і Каця кажуць, што на Цнянцы з гэтым праблем няма: там пляцоўка абсталявана на найвышэйшым узроўні.

Ёсць на Цнянскім вадасховішчы яшчэ адна незвычайная забава для самых моцных і цягавітых. Правілы гульні: таму, хто правісіць на перакладзіне дзве хвіліны — прыз у памеры 300 тысяч рублёў. Кошт удзелу — 30 тысяч. Але перамагчы, як высветлілася, не так проста: толькі пры мне чатыры хлопцы не змаглі справіцца з той самай перакладзінай.



Калі паркоўвачных месцаў мала, даводзіцца парушаць правілы, каб паставіць свой аўтамабіль.



Трава тут выслана недакуркамі.

## ПРА КВАС, СМЕЦЦЕ І ДАПАМОГУ

— Мне, калі ласка, шклянку квасу і марожанае, — звяртаецца да прадаўшчыцы адной з мясцовых кавярняў бялявая дзяўчына. — Не, давайце дзве шклянкі, каб па сто разоў не бегаць.

Гэтыя два прадукты з'яўляюцца самымі распаўсюджанымі сярод наведвальнікаў пляжа. Косця з сябрамі часта ходзіць на Камсамольскае возера і рэкамендуе браць напоі з сабою, якія можна набыць у найбліжэйшай краме. Так хлопец спрабуе эканоміць. Хай няшмат, але ўсё ж такі. Адрозніваюцца цэны і на пляжах: на Камсамольскім возеры 0,5 літра квасу каштуе 15 тысяч, на Цнянскім вадасховішчы — 8 тысяч.

Да спіса папулярных прадуктаў можна яшчэ далучыць піва, чыпсы і арэшкі. Праўда, распіваць спіртныя напоі можна толькі ў адведзеных для гэтага месцах. Чаго, на жаль, не скажаш, пра курэнне. Трава на Камсамольскім проста выслана недакуркамі! Незразумелая сітуацыя і з кантэйнерамі для смецця: адна палова стаіць пустая, другая — забітая да краёў. Трэба адзначыць, што цнянскія ўрны выглядаюць больш «прэзентабельна».

— На Цнянскім вадасховішчы ў прыбіральню за 2 тысячы схадзіць можна. Чаму ў вас тут так дорага? — пытаецца ў касіра незадаволеная адпачывальніца.

Жанчына ў адказ толькі паціснула плячыма. Прыбіральня на Камсамольскім возеры каштуе пяць тысяч рублёў. Памяшканне чыстае, тут ёсць мыла, туалетная папера, люстэркі.

За ўвесь час (прыкладна гадзіны тры) на Камсамольскім возеры я не сустрэла ніводнага міліцыянера. Не бачыла і машыны дзяжурнай брыгады хуткай дапамогі. На Цнянскім вадасховішчы ў гэты ж дзень можна было знайсці і першых, і другіх.

Дзень заканчваўся, а я паспела трохі загарэць і, галоўнае, адпачыць. Так, нават не выязджаючы за мяжу ў гарачыя краіны, можна нядрэнна правесці выхадныя і ў нас. Галоўнае — гэта добрае надвор'е (з чым праблем зараз дакладна няма), ваш настрой і вясёлая кампанія. А яшчэ — уменне абстрагавацца ад дробных недапрацовак, каб яны не сапсавалі вам адпачынак.

**Кацярына АСМЫКОВІЧ.**
**Фота аўтара.**

### Каментарый да тэмы

# РАССЛАБЛЯЦЦА ТРЭБА З РОЗУМАМ

## Каб не толькі сонца галаву не «напякло»

**Адным з упадабаных месцаў баўлення часу мінчан і гасцей сталіцы з'яўляюцца пляжы Цнянскага вадасховішча. Аднак частка тых адпачынак нельга назваць культурным. Нягледзячы на ўсе забароны і папярэджанні з боку праваахоўных органаў, а таксама на тое, што адміністрацыя Савецкага раёна імкнецца стварыць усе неабходныя ўмовы для годнага адпачынку (ажыццяўляецца прыборка тэрыторыі работнікамі камунальных службаў, а таксама своечасовы вываз смецця; маюцца валейбольныя і дзіцячыя пляцоўкі, веладарожкі, апроч таго, прыбіральні і кабінкі для пераапранання), некаторыя грамадзяне працягваюць грэбаваць правіламі знаходжання ў месцах культурна-масавага адпачынку, парушаючы гэтым не толькі маральныя нормы, але нормы адміністрацыйнага заканадаўства.**

Па словах начальніка аддзела аховы правапарадку і прафілактыкі Савецкага РУУС сталіцы Цімура Кеселя, пляжы, размешчаныя на беразе Цнянскага вадасховішча, а таксама прылеглая да іх тэрыторыя знаходзяцца пад узмоцненым кантролем з боку супрацоўнікаў міліцыі. Толькі за мінулыя выхадныя імі сумесна з байцамі АМАП ГУУС Мінгарвыканкама было выяўлена больш за 58 парушэнняў адміністрацыйнага заканадаўства, самымі распаўсюджанымі з якіх з'яўляюцца выпадкі распіцця спіртных напояў. Начальнік Савецкага РУУС Максім Гамоля нагадвае, што за падобныя дзеянні артыкулам 17.3 Кодэкса аб адміністрацыйных правапарушэннях Рэспублікі Беларусь («Распіццё алкагольных, слабаалкагольных напояў ці піва ў грамадскім месцы або з'яўленне ў грамадскім месцы або на працы ў стане ап'янення») прадугледжана адказнасць у выглядзе штрафу, велічыня якога можа дасягаць пятнаццаці базавых велічынь. Акрамя таго, распіццё спіртных напояў, спалучанае са знаходжаннем на пляжы ў той час, калі тэмпература паветра дасягае 32-34 °С, можа пацягнуць за сабой самыя непрадказальныя і незваротныя наступствы для здароўя чалавека, а таксама небяспеку для яго жыцця.

З улікам таго, што ў некаторых выпадках грамадзяне аддаюць перавагу не грамадскаму транспарту, а асабістаму, супрацоўнікамі АДАІ РУУС нярэдка выяўляюцца выпадкі парушэння правілаў паркоўкі транспартных сродкаў паблізу Цнянскага вадасховішча, што служыць прычынай складання пратаколаў аб адміністрацыйных правапарушэннях. Правапарушальнік таксама абавязаны будзе выплаціць штраф, велічыня якога можа дасягаць дзесяці базавых велічынь.

Як растлумачыў намеснік начальніка РУУС Аляксандр Філіпчык, яшчэ адным частым парушэннем адміністрацыйнага заканадаўства з'яўляецца купанне ў неўсталяваных месцах. Яно цягне за сабой накладанне штрафу ў памеры ад адной да трох базавых велічынь. Часцяком правапарушальнікі проста не ўсведамляюць таго, што яны рызыкуюць сваімі жыццём і здароўем, купаючыся ў неправераных і не прыстасаваных для гэтых мэт месцах.

Начальнік міліцыі грамадскай бяспекі Віктар Станіслаўчык нагадаў аб неабходнасці старанна сачыць за захаванасцю маёмасці, прынесенай на пляж. Трапляючы на доўгачаканы адпачынак, знаходзячыся ў коле родных і сяброў, грамадзяне расслабляюцца і нярэдка губляюць пільнасць, даючы зламыснікам ідэальную магчымасць для здзяйснення іх намераў. Увагу злачынцаў прыцягваюць мабільныя тэлефоны, кашалькі, дакументы, планшэты, ноўтбукі. Таму лепш не браць з сабой на пляж каштоўныя рэчы ці не пакідаць іх на беразе без нагляду.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**
*rs@zviazda.by*

# Дыхаць у сталіцы становіцца цяжэй

**У сувязі з неспрыяльнымі метэаралагічнымі ўмовамі (павышаны тэмпературны рэжым, магутныя прыземныя інверсіі, слабы вецер, штыль і адсутнасць ападкаў) у горадзе стварыліся ўмовы, якія спрыяюць назапашванню забруджвальных рэчываў у прыземным слоі паветра. Аб гэтым паведамляе сталічная санэпідэмслужба.**

Па выніках вымярэнняў на пунктах маніторынгу атмасфернага паветра Гідрамета з 3 па 10 жніўня 2015 года ў Мінску ўтрыманне ў паветры забруджвальных рэчываў павысілася ў сярэднім у 1,5—2 разы. Аднак перавышэнне нарматываў адзначана пераважна па цвёрдых часціцах і прыземным азоне. У раёне вуліцы Шчорса канцэнтрацыя фенолу ў 1,3 раза перавысіла гранічна дапушчальную норму. Даныя вымярэнняў сведчаць аб павелічэнні ўтрымання ў паветры аксіду вугляроду і дыяксіду азоту, аднак перавышэнняў гранічна дапушчальных нормаў па гэтых рэчывах пакуль не рэгістравалася.

У сувязі з неспрыяльнымі для рассейвання забруджвальных рэчываў метэаўмовамі кантроль за якасцю атмасфернага паветра ў сталіцы быў з боку санэпідслужбы ўзмоцнены, асабліва на тэрыторыях, што прылягаюць да буйных аўтамагістраляў. Перавышэнне ўтрымання канцэнтрацый фармальдэгіду адзначана ў зонах уплыву аўтамагістраляў ва ўсіх раёнах горада.

У сувязі з вышэйсказаным, санэпідэмслужба сталіцы нагадвае мінчанам пра неабходнасць захавання наступных рэкамендацый:

✓у перыяд неспрыяльных для рассейвання забруджвальных рэчываў метэаўмоў трэба як мага радзей быць на вуліцы, менш часу праводзіць паблізу аўтамагістраляў, па магчымасці трымаць вокны зачыненымі;

✓у памяшканнях рэкамендуецца часцей праводзіць вільготную прыборку;

✓пасрабуйце не перанапружвацца фізічна: Любая дадатковая фізічная нагрузка прымусіць вас дыхаць часцей і глыбей, што ў сітуацыі неспрыяльных экалагічных умоў можа адбіцца негатыўна на вашым здароўі;

✓уладальнікам аўтатранспартных сродкаў па магчымасці трэба карыстацца грамадскім транспартам;

✓нельга пакідаць дзяцей і жывёл у прыпаркаваных транспартных сродках;

✓нельга спальваць лісце і смецце на тэрыторыях прыватных домаўладанняў і праводзіць любыя работы, што прыводзяць да павышанага пылаўтварэння.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**
*nikalaeva@zviazda.by*

## Азбука бяспекі

# МАБІЛЬНІК І СПЁКА НЕСУМЯШЧАЛЬНЫЯ

## КАЛІ ВЫ ЗНАХОДЗІЦЕСЯ ЗА РУЛЁМ АЎТО

**Сталічная Дзяржаўтаінспекцыя ўзмоцніць кантроль за кіроўцамі, якія размаўляюць падчас руху па мабільным тэлефоне. Толькі ў мінулым месяцы за гэтае парушэнне ў Мінску было прыцягнута да адміністрацыйнай адказнасці каля 400 кіроўцаў, паведамілі ў ДАІ ГУУС Мінгарвыканкама.**

Выкарыстанне мабільнага тэлефона падчас руху прыводзіць да няўважлівасці пры манёўраванні, назіраецца хаатычная манера язды, ігнараванне знакаў і дарожнай разметкі. За парушэнне асобай, якая кіравала транспартным сродкам (за выключэннем вадзіцеляў транспартных сродкаў аператыўнага прызначэння), правілаў карыстання радыё- і тэлефоннай сувяззю падчас руху на яе накладваецца штраф памерам да 2 базавых велічынь, за паўторнае такое парушэнне цягам года — штраф памерам ад 2 да 8 базавых велічынь.

**Сяргей РАСОЛЬКА**

TV@R

Святлана СТАТКЕВІЧ:

# «Прыгажосць — рэкамендацыйны ліст, а паказваеш сябе на справах»



**З 24 па 30 жніўня беларуская сталіца будзе прымаць міжнародны конкурс прыгажосці «Місіс Сусвет — 2015», які збярэ разам прыгожых жанчын больш чым з 50 краін свету. Асноўная мэта мерапрыемства сёлета — звярнуць увагу на праблемы гвалту. І на форуме, які кожны год праводзіцца ў рамках конкурсу, кожная з удзельніц раскажа пра сваё бачанне такіх праблем і прапануе, як іх вырашаць. Прадстаўляць Беларусь будзе Святлана СТАТКЕВІЧ. Яна ўжо не першы раз прымае ўдзел у такіх спаборніцтвах. Напрыклад, у конкурсе «Miss&Mrs Multiverse International 2013» здабыла тытул трэцяй «Віцэ-місіс» і перамогу ў намінацыі «Mrs.Social Media». Напярэдадні новага важнага спаборніцтва мы сустрэліся са Святланай, каб пагаварыць пра прыгажосць і тыя магчымасці, якія здольны мяняць жыццё да лепшага.**

***— Як праходзіў адбор на конкурс «Місіс Сусвет — 2015»?***

— Я даслала ліст нацыянальнаму дырэктару Наталлі Трафімавай і падала заяўку. Адтуль, наколькі я ведаю, усе заяўкі перасылаюцца арганізацыйнаму камітэту ў Балгарыю. Таму што арганізатарам правоў на конкурс з'яўляецца балгарская кампанія «Mrs. Universe LTD». І яны самі выбіралі прадстаўніцу ад Беларусі.

***— Якія ўмовы былі, каб трапіць у лік прэтэндэнтак?***

— Актыўная жыццёвая пазіцыя, дабрачыннасць і добрыя знешнія даныя. Але ў конкурсе «Місіс Сусвет» акцэнт робіцца не на прыгажосці, а менавіта на добрых справах, якія зроблены прэтэндэнткай. У гэтым, можна сказаць, і галоўнае адрозненне ад конкурсу прыгажосці «Міс». Бо там канкурсанткай можа быць прыгожая маладая дзяўчына і на нешта закрываюцца вочы. Кажуць жа, быццам прыгажосць — гэта заўчасны рэкамендацыйны ліст. А потым ты ўжо паказваеш сябе на справах.

Для мяне любы конкурс — проста залік. Я яго здаю і іду далей. Пры гэтым не выстаўляю напаказ тое, што маю нейкія тытулы. Хаця, безумоўна, мне гэта дапамагае на дабрачынных мерапрыемствах. Калі мы з сацыяльнай платформай CentroLIFE і Дзіцячым фондам зімой праводзілі акцыю, каб сабраць малым падарункі на Новы год, то было прыемна, што ўдзельніцы конкурсаў прыгажосці розных гадоў аб'ядналіся дзеля такой добрай справы. Людзі бачылі нас і больш ахвотна адклікаліся на просьбу дапамагчы. Таму, мяркую, у гэтым ёсць свае плюсы.

***— А даводзіцца сутыкацца з неразуменнем, калі імкнешся дапамагаць іншым?***



— Са мной такога не здаралася. І думаю, прычынай таму служыць тое, што нашы ўчынкі гавораць за нас. Бывае, тэлефануеш людзям і тлумачыш намер правесці дабрачынную акцыю ці кампанію, і, калі яны чулі тваё імя і ведаюць, як ты ставішся да сваёй дзейнасці, адразу асацыяцыя з добрымі справамі. Я супрацоўнічала з Дзіцячым фондам, зараз працую ў камандзе CentroLIFE. Мне здаецца, што ў будучыні, магчыма, я яшчэ траплю ў сітуацыю, калі мае тытулы змогуць неяк паспрыяць. Як кажуць, слава пойдзе наперадзе і дапаможа адчыніць патрэбныя дзверы.

***— Некалі вы расказвалі, што на занятку дабрачыннасцю натхніў прыклад бацькі, які меў сваю справу і дапамагаў іншым. Вашы сын і дачка, назіраючы за вамі, як рэагуюць на дабрачынную дзейнасць мамы?***

— Я бачу, як мае дзеці адносяцца да жывёл: імкнуцца пакарміць коціка і сабачку. Думаю, яны бачаць мой прыклад і самі жадаюць рабіць дабро. У майго сына ёсць любімая машынка, якую ён прынёс мне, каб аддаць дзеткам. Я ведала, што даваць такую цацку не зусім правільна, але ж разумела, наколькі яна дарагая для майго сына. Патлумачыла яму, што лепей мы дапаможам дзеткам грашыма, увагай. І вельмі парадавалася такому ўчынку сына...

***— Вернемся да конкурсу. Як ідзе падрыхтоўка да будучага марафону прыгажосці?***

— Падрыхтоўка ўжо пачалася. Прыемна, што ўжо на прэс-канферэнцыі Першая прыватная касцюмерная Вольгі Кубекінай і Арыны Піхтавай прадставіла мне народны строй. Яны таксама будуць распрацоўваць мой нацыянальны касцюм для конкурсу. А вячэрняй сукенкай для фінальнага шоу займаецца вытворца вясельных убораў Людміла Давідовіч, заснавальніца моднага дома «Florence». Таму і ў гэтым напрамку работа даўно кіпіць. Я размаўляла з канкурсанткамі, якія абаранялі гонар нашай краіны на гэтым конкурсе ў мінулыя гады, каб правільна пабудаваць сваё выступленне. Пакуль не буду раскрываць яго змест. Толькі скажу, што тэму, якая вызначана сёлета як «Барацьба з гвалтам», буду раскрываць на беларускай і англійскай мовах. Спадзяюся, што для прадстаўніц Украіны, Балгарыі, Расіі, Польшчы менавіта беларуская мова будзе больш зразумелай.

***— Спаборніцтва такога кшталту для вас не першае. Хваляванне прысутнічае?***

— Шчыра кажучы, я вельмі камфортна адчуваю сябе перад публікай і на подыуме. А вось падчас прэс-канферэнцыі хваляванне прысутнічала. Такога адчування ў мяне не было раней.

***— Конкурс «Місіс Сусвет» робіць акцэнт на тое, каб паказаць прыклад адукаванай, прыгожай, актыўнай жанчыны, маці. Па вашых назіраннях, большасць сучасных жанчын да чаго імкнецца?***

— Гэтае мерапрыемства сапраўды з'яўляецца прэстыжным і спрыяе павышэнню сацыяльна-актыўнай ролі жанчыны ў сучасным грамадстве. Арганізатары ў асобе старшыні аргкамітэта Наталлі Трафімавай у наш не просты час адважыліся зрабіць сацыяльна значнае мерапрыемства, якое раскрывае не толькі патэнцыял удзельніц конкурсу, але і патэнцыял нашай краіны, адкрытай, талерантнай і гуманістычнай, арыентаванай на ўзаемадзеянне культур і народаў.

**Клапаціцца трэба не толькі пра знешнасць — куды важнейшае менавіта ўнутранае напаўненне. Таму не падганяйце сябе пад нейкія эталоны прыгажосці**

Вельмі сур'ёзнае пытанне: да чаго імкнуцца сёння жанчыны? Ці сапраўды шмат за гэтым назіраю. Некаторыя мараць пра машыны, салоны прыгажосці... Што, на мой погляд, тлумачыцца няправільным выхаваннем многіх дзяўчат. Ім жа з дзяцінства кажуць: ты прыгажуня, прынцэса... Бацькі з апошніх сіл стараюцца, каб у дачкі былі прыгожыя строі. Я прыхільнік таго, каб укладваць грошы ў выхаванне і адукацыю дзяцей. Бо, калі бачыш сэлфі невядома адкуль, становіцца сапраўды няёмка... Дзяўчынку варта выхоўваць як лэдзі. Яна не абавязкова павінна трымаць відэлец з нажом за сталом, аднак ведаць, калі прамаўчаць у прысутнасці дарослых, паважаць бацькоў — гэта проста неабходна. Клапаціцца трэба не толькі пра знешнасць — куды важнейшае менавіта ўнутранае напаўненне. Таму не падганяйце сябе пад нейкія эталоны прыгажосці, а займайцеся ўнутраным самаразвіццём.

***— А па якіх характарыстыках можна вызначыць сёння сапраўднага мужчыну?***

— Мужчына павінен быць Мужчынам. Гэта той, чые словы не разыходзяцца з дзеяннямі. Жанчыну такі мужчына лічыць багіняй і ганарыцца сваёй абраннніцай. Я часам назіраю сітуацыю, калі мужчыны сароміцца сваіх палавінак, у коле сяброў могуць зняважліва сказаць нешта пра іх. І гэта для мяне не ўчынак, таму што так яны выказваюць непавагу да ўласнага выбару. Сучасныя мужчыны забываюцца знаходзіць час для сваіх жанчын. А можна ж і гуляць разам, і гатаваць вячэру... Важна клапаціцца адно пра аднаго. Якую б незалежнасць мы не дэманстравалі, нам прыемна адчуць падтрымку каханага, мець магчымасць параіцца з ім.

***— Складана сумяшчаць свае любімыя справы і абавязкі маці, гаспадыні?***

| Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5%) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты за предмет аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после подписания договора купли-продажи | | | | |
| Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона, оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.cpo.by** | | | | |
| *Извещение о проведении предыдущего аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 15.07.2015 г.* | | | | |
| **Дата и время проведения аукциона** | **25.08.2015 в 14.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, офис 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** | | | |
| **Дата и время окончания приема документов** | **24.08.2015 до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, офис 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** | | | |
| **Контактные телефоны** | **Тел: +375 17-280-36-37; +375 29-183-69-71. E-mail: auction@cpo.by** | | | |

**УВЕДОМЛЕНИЕ АКЦИОНЕРОВ**
**ОАО «АМКОДОР – ДЗЕРЖИНСК»**
**об их праве требовать выкуп акций**

12 августа 2015 года внеочередным общим собранием акционеров Открытого акционерного общества «АМКОДОР – ДЗЕРЖИНСК», находящегося по адресу: 222720, Минская область, г. Дзержинск, ул. Фоминых, 19, принято решение о совершении крупной сделки.

Акционеры общества, которые не участвовали в данном собрании акционеров или голосовали на данном собрании акционеров против принятия решения о совершении крупной сделки, вправе требовать выкупа обществом принадлежащих им акций общества. Утвержденная собранием акционеров цена выкупа акций: 10 887 рублей за одну акцию. Срок подачи акционерами заявлений с требованием о выкупе акций с 12 августа 2015 года по 1 октября 2015 года. Срок удовлетворения обществом требований о выкупе акций (заключения договоров купли-продажи) со 2 октября 2015 года по 2 октября 2016 года. Выкупленные обществом по требованию его акционеров акции подлежат аннулированию. Прием требований акционеров о выкупе акций и последующее заключение договоров купли-продажи акций осуществляется по адресу: г. Дзержинск, ул. Фоминых, 19, приемная руководителя на 2-м этаже в рабочие дни с 8.00 до 16.30, обеденный перерыв с 12.30 до 13.00.

*Совет директоров ОАО «Амкодор – Дзержинск»*

УНП 600005769

**Ликвидатор объявляет о проведении 24.08.15 в 14.00 по адресу: Минск, ул. Л. Беды, 29-2Н повторных торгов**
**по продаже имущества ООО «Топ Бетон»:**
**1) коровник, 1602,6 кв.м, 1965 г.п.,** начальная цена 786 762 000 руб. без учета НДС;
**2) здание котельной, 79,8 кв.м, 1965 г.п.,** начальная цена 75 537 000 руб. без учета НДС.
Недвижимые улучшения расположены на участке с/х назначения площадью **466,2670 га** (кадастровый № 623684300001000112), адрес: **Минский р-н, д. Климовичи.** Шаг торгов – 5%.
*Задаток в размере 10% от начальной цены лота перечисляется на р/с 3012018490017 ОАО «Приорбанк» ЦБУ 116, код 749, УНП 190800527. Заявления на участие в торгах направляются по адресу: 220002, Минск, а/я 33* **в срок по 19.08.15 г.** Справки по тел. 8(029)6285969. УНП 191228804

**Ликвидатор объявляет о проведении 14.09.15 в 14.00 по адресу: Минск, ул. Л. Беды, 29-2Н торгов**
**по продаже имущества УП «Беланиса»:**
**1) Аппарат игровой Poker- 02.03Multimillioner v.507 – 3 шт.,** начальная цена 6 200 000 руб. каждый без учета НДС;
**2) Аппарат игровой Poker-02.02 – 5 шт.,** начальная цена 10 900 000 руб., каждый без учета НДС. Имущество находится **в г. Минске.**
Шаг торгов – 5%.
*Задаток в размере 10% от начальной цены лота перечисляется на р/с 3012018490017 ОАО «Приорбанк» ЦБУ 116, код 749, УНП 190800527. Заявления на участие в торгах направляются по адресу: 220002, Минск, а/я 33* **в срок по 09.09.15 г.** Справки по тел. 8029763-97-34. УНП 191228804

Утерянные страховые свидетельства «Добровольное страхование от несчастных случаев» формы 2РН серия БН № 1918735 в количестве 1 штуки, «Добровольное страхование имущества» формы 2РН серии ИГ № 0513183 в количестве 1 штуки в представительстве Белгосстраха по Солигорскому району **считать недействительными.** УНП 600013344

Утерянный бланк квитанции о приеме денежных средств страховой компании «ПромТрансИнвест» № КС 3257945 просьба **считать недействительными.**

■ Шляхамі творцы

# НЕВЯДОМАЕ ПРА ШАГАЛА

## І цікавае пра вучня Пэна: містыфікатара Шульмана, які стаў Гаспарам...

**Бадай, пра Шагала і яго калег, якія працавалі ў паслярэвалюцыйным Віцебску, вядома ўжо ўсё. Але даследчыкі не перастаюць здзіўляць. Карэспандэнт «Звязды» занатаваў свежыя малавядомыя факты, якія нядаўна ў Віцебску агучылі шагалазнаўцы.**


Шульман, які стаў Гаспарам.

НАГАДАЮ, што ў Віцебску задумалі стварыць «шагалаўскі квартал». Побач з домам, які належаў сям'і мастака, у перспектыве адкрыюць майстэрні, кавярні, гатэль... Добрай дапамогай для архітэктараў, рэстаўратараў стануць унікальныя здымкі. Чарговы з іх нядаўна з'явіўся ў віцебскім музеі.

— «Звязда» першай паведаміла пра тое, што ў нас летась з'явіліся здымкі, зробленыя ў 1941 годзе з нямецкага самалёта. А нядаўна ў фонды музея паступіла чарговая фатаграфія. Яна была зроблена ў першыя дні вайны з самалёта, які ляцеў на невялікай вышыні. На фота і будынак, дзе цяпер размяшчаецца дом-музей Шагала. Побач усё амаль што поўнасцю разбурана, а шагалаўскі дом — пад дахам. Гэтае маленькае фота памерамі 6 на 9 сантыметраў разам з іншымі змогуць даць уяўленні пра тое, як выглядалі шагалаўскія месцы. На «панараме» фотадакументаў ёсць і выява былога дома банкіра Вішняка, дзе пасля рэвалюцыі працавалі Шагал, Малевіч, Лісіцкі і іншыя... Насамрэч, унікальны выпадак: у Віцебску падчас вайны і пасля, калі, скажам так, не асабліва шанавалі забудову мінулага, не разбурылі будынкі, звязаныя з Шагалам, — распавядае **Валерый ШЫШАНАЎ, намеснік дырэктара па навуцы Віцебскага абласнога краязнаўчага музея**.

Пра будынкі Віцебска, якія ў год святкавання першай гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі ўпрыгожваў Шагал з калегамі, вядома. А ці маюць рацыю тыя, хто сцвярджае, што Шагал браў удзел у афармленні горада напярэдадні першамайскага свята 1919 года?

— Да нашых дзён захаваліся кадры 10-хвіліннай кінахронікі, якая дае ўяўленне, якім быў Віцебск 7 лістапада 1918 года. Адно з пано па эскізе Шагала вісела на будынку, дзе ў наш час знаходзіцца мастацкі музей. Яшчэ адно «Прывітанне Луначарскаму» — на фасадзе пралетарскага клуба (што цікава, цяпер па адрасе Маякоўскага, дом 1 размяшчаецца дырэкцыя фэсту «Славянскі базар у Віцебску». — **Аўт.**). Па логіцы, як камісар мастацтваў, Шагал павінен быў прыняць удзел у афармленні горада да 1 мая 1919 года. Некаторыя даследчыкі пішуць пра гэта як аб факце, які адбыўся. Аднак выяўленыя нядаўна ў дзяржаўным архіве дакументы дазваляюць канстатаваць іншае... Шагал гэтым не займаўся, — здзіўляе **гісторык Людміла ХМЯЛЬНІЦКАЯ**.

ФІЛЬМ «Шагал — Малевіч» знакамітага рэжысёра Аляксандра Міты, які ў тым ліку здымаўся ў Віцебску (восенню 2012 года. — **Аўт.**), дае ўяўленне пра рамантыка Шагала. Складваецца ўражанне, што ён прыехаў на малую радзіму, каб зрабіць Віцебск другім Парыжам, каб адкрыць таленты, не думаючы пра сябе. Але ж...

— З Еўропы ў Віцебск прыехаў ужо не Майсей, а Марк — вядомы мастак. Ідэя заснаваць школу мастацтваў у яго з'явілася яшчэ да рэвалюцыі. Стаўленне да апошняй у яго вельмі супярэчлівае, але ён хутка ацаніў новыя магчымасці, якія могуць адкрыцца. Тым больш што з некаторымі вядомымі рэвалюцыянерамі ён пазнаёміўся яшчэ ў Парыжы, напрыклад, з Луначарскім. Падчас перапіскі Шагал умела падводзіць, што рашэнне аб адкрыцці вучылішча не можа падвяргацца сумненням. У адпаведнай дакладной ён настойвае і пераканаўча патрабуе таго, што патрэбна для стварэння фактычна першай у Беларусі вышэйшай мастацкай навучальнай установы. Фільм «Шагал — Малевіч» не дакументальны. І Шагал там паказаны, мякка кажучы, не такім, якім быў насамрэч. Марк Захаравіч — чалавек, які мэтанакіравана ішоў да рэалізацыі сваёй ідэі. І дабіўся таго, чаго хацеў. Урачыстае адкрыццё навучальнай установы адбылося 28 студзеня 1919 года. На той час Шагал быў упаўнаважаным Калегіі па справах мастацтваў у Віцебскай губерні. Дырэктарам вучылішча быў каля года... Падчас працы ў горадзе ён канфліктаваў з прадстаўнікамі мясцовай улады. Але пры гэтым вельмі добра супрацоўнічаў са сталічнай уладай, — разважае **Марына КАРМАН, старшы навуковы супрацоўнік Віцебскага цэнтра сучаснага мастацтва**.

Найлепшым сябрам Шагала называў сабе амерыканскі мастак Гаспар (пры нараджэнні Шульман. — **Аўт.**).


Шульман-Гаспар любіў маляваць масты.

Вывучаючы яго біяграфію, можна зрабіць выснову, што гэты чалавек вельмі нагадвае літаратурнага героя Мюнхаўзена.

— Ён нарадзіўся ў красавіку 1882 года на тэрыторыі сённяшняй Смаленскай вобласці. Потым яго небагатая сям'я пераехала ў мястэчка Янавічы (сучасны Віцебскі раён). Ён вучань Пэна, які лічыў Лейба Шульмана адным з самых адораных. Пераважна на грошы свайго настаўніка паехаў вучыцца ў Еўропу. У Парыжы Шульман змяніў прозвішча. Ажаніўся з багатай амерыканкай. Але яе бацькі яго не вельмі добра ўспрынялі, бо не любілі яўрэяў. Каб утойваць сваю нацыянальнасць, падрабляў дакументы, у прыватнасці ў дакументах аб шлюбе запісаны праваслаўным... Ён даказваў, што служыў у французскай арміі, ёсць яго фота ў лётнай форме. Але ўпэўненасці ў гэтым у сур'ёзных даследчыкаў няма. Не пацверджана тое, што яго самалёт быў збіты, што ён доўгі час лячыўся ў шпіталі. Мастак спакойна мог выкарыстаць вайну для сваіх мэт... Гэты чалавек у 1916 годзе пасяліўся ў Амерыцы. Пасля смачнага абеду мог шмат чаго распавесці. Напрыклад, пра Бэлу, якая яго кахала, але ён саступіў сваму сябру Шагалу, пра блізкае знаёмства з Шаляпін і Горкім. Чулі суразмоўцы і пра сяброўства з Пастарнакам ужо пасля таго, як апошні стаў нобелеўскім лаўрэатам, — расказвае **Галіна ДЫМЕНТ, прафесар літаратуры ўніверсітэта штата Вашынгтон у Сіэтле**.

МАСТАК і творы падпісваў так, што не разбярэшся. Вядома пра тое, што ён спецыяльна мяняў на старых карцінах подпісы на новае прозвішча...

— Мог назваць палатно, як жадаў, — працягвае амерыканская даследчыца. Таму не дзіўна, што мост у Віцебску вельмі нагадвае іншы... Містыфікатар памёр у лютым 1964 года. Яго творы знаходзяцца ў музеях трох штатаў: Тэхас, Аклахома і Вашынгтон. Другая жонка Шульмана (больш чым на 20 гадоў маладзейшая за яго) стала добрым менеджарам па продажы палотнаў. На аўкцыёнах творы Шульмана-Гаспара каштуюць і па 20, і па 30 тысяч долараў.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**
*pukshanski@zviazda.by*

■

# Яшчэ тры карціны

## Буйная карпаратыўная калекцыя павялічваецца

**Мецэнаты працягваюць сваю дастойную дзейнасць па вяртанні здабыткаў беларускай культуры на радзіму. Белгазпрамбанк набыў у сваю калекцыю яшчэ тры карціны слынных беларускіх мастакоў і лічыць, што перайшоў да прытрымлівання глабальнай мэты — рэканструкцыі развіцця беларускага жывапісу.**

Калекцыя ўзбагацілася трыма новымі здабыткамі — карцінамі «Замак» Апалінарыя Гараўскага, «Летам. Ветраны дзень» Рыгора Баброўскага і «Пейзаж. Вілія» Фердынанда Рушчыца.

Творы шляхціца, руска-беларускага жывапісца Апалінарыя Гараўскага даволі шырока прадстаўлены ў Беларусі, толькі ў Нацыянальным мастацкім музеі знаходзіцца больш за сорак яго карцін. Лічыцца, што «Замак» здольны паказаць аўтара з іншага, невядомага да гэтых часоў, рамантычнага боку. Магічны, атмасферны будынак паўстае як цэнтр міфічнага свету, у які хочацца трапіць і падыхаць яго паветрам.

Адзін з настаўнікаў Марка Шагала Рыгор Баброўскі, ураджэнец Віцебска, наадварот, амаль не існуе ў беларускіх калекцыях. Карціна «Летам. Ветраны дзень», напісаная маслам, стварае кантраст з першым экспанатам — іншы свет і іншае паветра. Лёгкасць пад цяжарам неба — дысананс. Звычайная бяздзейнасць і таемныя непрадказальныя сілы прыроды.

«Пейзаж. Вілія» — і сведка, і вынік глыбокай сувязі Фердынанда Рушчыца з роднай зямлёй. Мастак вучыўся пад кіраўніцтвам Куінджы і Шышкіна ў Санкт-Пецярбургу, меў цесныя стасункі з Польшчай, быў прафесарам Кракаўскай акадэміі мастацтваў, узнагароджаны французскім ордэнам Ганаровага легіёна. А памёр пад Валожынам, там жа, дзе і нарадзіўся. І ў пейзажа — нацыянальны характар.

Карпаратыўная калекцыя Белгазпрамбанка можа пахваліцца карцінамі мастакоў парыжскай школы першай паловы XX стагоддзя. З чаго ўсё і пачыналася. Марк Шагал, Хаім Суцін, Восіп Любіч, Шрага Царфін, Міхаіл Кікоін, Восіп Цадкін і іншыя не проста ўзбагачаюць чыюсьці калекцыю: набываючы такія творы, банк (Беларусі) такім чынам захоўвае выбітных аўтараў на радзіме. Збор банка паспяхова пашырыўся новымі імёнамі: Леон Бакст, Дзмітрый Сцялецкі, Рыгор Глюкман, Станіслаў Жукоўскі, Валенцій Ваньковіч, Сімяон Полацкі (банк прыдбаў кнігу «Жазло праўлення» 1667 года).

**Ірэна КАЦЯЛОВІЧ.**
*katsyalovich@zviazda.by*

■ Ведай нашых!

# ГІРАЙ Б'Е РЭКОРДЫ

## Імя гродзенскага гіравіка пяты раз у Кнізе рэкордаў Гінэса

**Сертыфікаты Кнігі рэкордаў Гінэса атрымаў некалькі дзён таму электрагазазваршчык ААТ «Гроднапрамбуд» Яўген НАЗАРЭВІЧ. У штаб-кватэрах гэтага славутага выдання ў Нью-Ёрку і Лондане афіцыйна пацвердзілі два сусветныя дасягненні беларускага гіравіка, якія ў красавіку сёлетняга года былі ўстаноўлены ў Гродне ў прысутнасці міжнародных суддзяў.**


Фота Сяргея ГАЎРЫЦЬКАГА.

У Кнігу рэкордаў Гінэса Яўген Назарэвіч упершыню трапіў у маі мінулага года, а два апошнія рэкорды (сёлета ў красавіку) раздзялілa ўсяго некалькі дзён. Першы — у жыме: напераменку левай і правай рукой гродзенец за гадзіну 1335 разоў падняў 24-кілаграмовую гіру. А другі — у рыўку: зноў жа мяняючы рукі, ён выканаў 1400 пад'ёмаў гіры. Такім чынам, агульная вага падчас устанаўлення апошняга рэкорду склала 33 тоны 600 кілаграмаў!

Дарэчы, акрамя пяці асабістых рэкордаў, у Яўгена ёсць столькі ж калектыўных, калі некалькі соцень спартсменаў сінхронна падымаюць гіру на час. Такія дасягненні таксама ўшанаваны Кнігай рэкордаў Гінэса. Грашовых прэмій пры гэтым не прадугледжана, але затое які гонар!

А пра матэрыяльнае стымуляванне здаровага ладу жыцця, заняткаў спортам паклапаціліся на прадпрыемстве «Гроднапрамбуд»: у калектыўным дагаворы пазначылі, што работнік, які стаў прызёрам чэмпіянату свету ці Еўропы, устанавіў рэкорд, атрымлівае даволі значную прэмію.

Каб не сурочыць, Яўген Назарэвіч лічыць за лепшае не гаварыць пра новыя рэкорды. Але, зразумела, спыняцца на дасягнутым не збіраецца. Цяпер у вольны ад работы час ён рыхтуецца да чэмпіянату свету, які ў кастрычніку збяруцца ў Гродне самыя моцныя гіравікі планеты.

Можа, хтосьці захоча таксама заняцца гіравым спортам, але не ведае, з чаго пачаць?

— Калі ласка, звяртайцеся, і я ахвотна падзялюся сваім вопытам, — прапануе рэкардсмен.

**Барыс ПРАКОПЧЫК.**

Азбука народнай культуры

ад Янкі Крука і Аксаны Катовіч

**Дзень тыдня як вызначальны фактар у лёсе чалавека**

Мы ўжо неаднаразова адзначалі, што ў сістэме светапоглядных уяўленняў беларусаў кожны дзень тыдня быў надзелены характэрнымі рысамі. Так, нашы продкі маглі прадказваць будучыню чалавека і па тым, у які дзень тыдня ён нарадзіўся. Прапануем вам параўнаць рысы свайго характару ў залежнасці ад дня вашага нараджэння.

◈ Народжаным у панядзелак не па плячы вялікія справы. Але ж характар у гэтых людзей, як правіла, рашучы і ўпарты. Многае ў іх жыцці залежыць ад настрою. Калі вы будзеце чапляцца да такога чалавека з маральнымі павучаннямі, то натыкнецеся на жалезабетонную сцяну, а ў крайніх выпадках знойдзеце ў ім ворага. Народжаныя ў панядзелак любяць пагаварыць, але найбольш за ўсё яны любяць, каб іх слухалі і пераймалі хвалілі. Не даюць у доўг і пра свае даўгі хутка забываюцца, пры гэтым заўсёды прыкмячаюць промахі і хібы іншых. Народжаныя ў панядзелак ядуць шмат мяса, любяць кветкі. Аднак тых, хто нарадзіўся бліжэй да вечара, мякчэйшыя па натуры і больш душэўныя.

◈ Народжаныя ў аўторак найчасцей сутулыя, смуглыя, з кароткай спартыўнай стрыжкай, крыху неахайныя. Аматары складаць байкі, у іх адсутнічае пачуццё сарамлівасці, таму здрады іх не здзіўляюць. Любяць спрэчкі. У той жа час яны адважныя, сваіх у бядзе не кінуць, абавязкова прыйдуць на дапамогу. Доўгажыхары, можа быць, таму што ўмеюць у жыцці прыстасоўвацца. Да старасці гэтыя людзі дасягаюць вызначаных поспехаў, запасаюць добры капітал, але знешне аб іх такога не падумаеш, бо яны ўмеюць маўчаць. Іх замкнёнасць, панурасць не адштурхоўваюць, а прыцягваюць да сябе, таму што іх прымаюць за самавітых, надзейных людзей.




Даты | Падзеі | Людзі

## 14 ЖНІЎНЯ



**1385** год — 630 гадоў таму ў Крэўскім замку (цяпер Смаргонскі раён) была заключана Крэўская унія, дзяржаўны саюз паміж Вялікім Княствам Літоўскім і Польшчай. Гэты дагавор — зацвярджэнне вялікім князем літоўскім Ягайлам папярэдне прынятых абавязацельстваў перайсці ў каталіцтва і ахрысціць паводле лацінскага абраду ўсіх язычнікаў-літоўцаў, а таксама стварыць дзяржаўны саюз (унію) ВКЛ і Кароны Польскай. Крэўскую унію падпісалі Ягайла, князі троцкі Скіргайла, мсціслаўскі Лугвен, ноўгарад-северскі Карыбут, троцкі і гродзенскі Вітаўт. Адной з прычын стварэння саюза з'явілася барацьба абедзвюх дзяржаў з Тэўтонскім ордэнам. У ім былі зацікаўлены літоўскія і беларускія феадалы, польская знаць, якая жадала спыніць ваенныя канфлікты з ВКЛ праз Валынь, а таксама каталіцкая царква, што атрымлівала магчымасць ахрысціць апошні паганскі народ у Еўропе. Абедзве дзяржавы аб'ядноўваў адзін манарх, але кожная з іх мела сваю сістэму кіравання, праводзіла самастойную палітыку. 2 лютага 1386 года на з'ездзе польскай шляхты ў Любліне Ягайла абраны каралём Польшчы, 4 сакавіка ён быў каранаваны. Адбывалася паступовае збліжэнне дзяржаўных інстытутаў ВКЛ і Польшчы, а таксама культурнае збліжэнне вярхоў грамадства. Дзякуючы саюзу ўдалося ліквідаваць пагрозу з боку Тэўтонскага ордэна, перамагчы яго ў Грунвальдскай бітве 1410 года, адкрыць гандлёвыя шляхі ў Заходнюю Еўропу. На ўсходзе ВКЛ з дапамогай Польшчы стрымлівала націск Маскоўскай дзяржавы. Вынікамі уніі былі шырокі дыпламатычны выхад ВКЛ у Еўропу, а таксама культурнае збліжэнне з іншымі яе краінамі.

**1944** год — нарадзілася (вёска Мікалаеўшчына Стаўбцоўскага раёна) Марыя Пятроўна Аношка, беларускі геолаг, геахімік і глебазнаўца, доктар геолага-мінералагічных навук (1999). У 1966 годзе скончыла БДУ. З 1974-га — у Інстытуце геахіміі і геафізікі НАН Беларусі. Аўтар навуковых прац па геахіміі элементаў, ландшафтаў, навакольнага асяроддзя, медыцынскай геахіміі.

**1986** год — прынята пастанова ЦК КПСС «Аб спыненні работ па перакідванні часткі сцёку паўночных і сібірскіх рэк». Ідэя перакідвання вод паўночных рэк у засушлівыя рэгіёны поўдня Расіі з дапамогай будаўніцтва сеткі каналаў упершыню стала абмяркоўвацца на мяжы XIX і XX стагоддзяў. Аднак, паколькі Імператарская Акадэмія навук заявіла аб сваім негатыўным стаўленні да такіх намераў, сур'ёзнага іх абмеркавання не праводзілася. Праект быў рэанімаваны ўжо пры савецкай уладзе. Планавалася, што канал даўжынёй 2,5 тысячы кіламетраў злучыць Об з засушлівымі раёнамі сярэднеазіяцкіх рэспублік. З прычыны асаблівасцей сібірскага рэльефу вада павінна была падымацца наверх з дапамогай некалькіх помпавых станцый. Аднак да гэтых планаў узнікла шмат прэтэнзій у экалагаў. Праз адток водных мас на поўдзень мяжа зоны холаду ў Сібіры зрушылася б на 50 кіламетраў у тым жа кірунку, паколькі тамтэйшыя рэкі нясуць на поўнач не толькі свае воды, але і цяпло. Акрамя таго, наканал мог перагарадзіць і традыцыйныя шляхі міграцыі дзікіх жывёл, што прынесла б нямала экалагічных непрыемнасцей. Па дарозе ж да Сярэдняй Азіі павінна было таксама адбывацца моцнае выпарэнне рачных вод, і, даходзячы да канчатковага пункта перакідвання, яны маглі аказацца моцна засоленымі. Далейшая экспертыза Дзяржплана СССР высветліла, што праекціроўшчыкі прынізілі меркаваныя выдаткі і пераболышылі эфектыўнасць праекта.

Было сказана

**Мікола МАЛЯЎКА, паэт:**

*Зямля бацькоў — адвечны слоўнік той,*
*Дзе ўсё цвіце, спявае, каласіцца.*

# СЁННЯ

| Сонца | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 5.45 | 20.42 | 14.57 |
| Віцебск — | 5.30 | 20.36 | 15.06 |
| Магілёў — | 5.35 | 20.32 | 14.57 |
| Гомель — | 5.37 | 20.24 | 14.47 |
| Гродна — | 6.01 | 20.57 | 14.56 |
| Брэст — | 6.06 | 20.52 | 14.46 |

## Месяц

*Маладзік у 17.54.*
*Месяц у сузор'і Льва.*

## Імяніны

*Пр. ПЕРШЫ СПАС (Макавей).*
*К. Сільвіі, Ясуся, Максіміляна.*


Фота Аляксандра ШАБЛЮКА.

# ЗАЎТРА




...у суседзяў

| | |
|---|---|
| ВАРШАВА | +29..+31°С |
| ВІЛЬНЮС | +24..+26°С |
| КІЕЎ | +29..+31°С |
| МАСКВА | +21..+23°С |
| РЫГА | +23..+25°С |
| С.-ПЕЦЯРБУРГ | +18..+20°С |

## УСМІХНЕМСЯ

Першы дзень дыеты. Я пазбавіўся ад усёй шкоднай ежы ў халадзільніку. Гэта было вельмі смачна.

**Нешта сёння галава не працуе. Не ўся, вядома. Ёсці магу.**

Вырашылі зваршчыкі адзначыць дзень нараджэння калегі. І, каб іх не злавілі ў працоўны дзень, яны напакавалі адзежу рыззём, прывязалі апарат да рукі і пакінулі пудзіла на вышыні стварaць бачнасць працоўнага працэсу. Вецер дзьме, апарат з электродам хістаецца, пудзіла быццам бы варыць — ну, а зваршчыкі, зразумела, выпіваюць. Выходзіць начальства са сталовай, глядзіць: усё нармальна, усе пры справе. І тут ад парыву ветру пудзіла падае з вышыні 70 метраў! Усе начальнікі хапаюцца за сэрца, бягуць да яго. Адзін зваршчык, бачачы гэта, бяжыць на месца здарэння, выкідае пудзіла і кладзецца замест яго. Падбягае начальства і бачыць — зваршчык устае, абтрасаецца і кажа:

— А трасцу я больш туды палезу!




ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.
РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫЛА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК.
Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».
НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.
ТЭЛЕФОНЫ: прыёмная – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 284 44 04, падпіскі і распаўсюджвання — 284 44 04, 287 17 21, бухгалтэрыі: 287 18 81.
Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by,
(для зваротаў): zvarot@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.
Тыраж 20.022. Індэкс 63850. Зак. № 3208.
Нумар падпісаны ў 19.30 13 жніўня 2015 года.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12